При планировании учебного процесса на кафедре в календарный учебно-производственный план каждой дисциплины включаются темы (разделы) для самостоятельного изучения. Контроль возлагается на лектора.

Одним из аспектов организации самостоятельной работы студентов является более широкое их привлечение к научно-исследовательской работе, к постановке и решению задач прикладного характера. Наиболее глубокие и новационные проработки *должны включаться в программы студенческих* конференций и применяться при разработке курсовых и дипломных проектов.

Особый интерес представляет работа студентов над курсовыми проектами. Это исключительно самостоятельная часть изучаемой дисциплины.

Наиболее целесообразно руководство всем курсовым проектированием, выполняемым на кафедре конкретным студентом, поручать одному руководителю, который в будущем осуществляет и руководство дипломным проектом, то есть применять сквозное проектирование.

К примеру на кафедре руководство курсовым проектированием конкретного студента по дисциплинам: "Технология ремонтно-обслуживающего производства", "Проектирование предприятий технического сервиса" и "Организация технического сервиса в АПК" осуществляется одним преподавателем. Он же является, как правило, и руководителем дипломного проекта. Задание на первый курсовой проект выдается в начале 8-го семестра и одновременно формируется тема дипломного проекта.

Такой подход к организации курсового и дипломного проектирования повышает ответственность студентов и их заинтересованность в активной самостоятельной работе, что повышает качество проектирования и в конечном итоге положительно влияет на подготовку специалистов для технического сервиса в АПК.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Капуста А.Я., препод.***

*Барановіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж*

Змены ў сучаснай сістэме адукацыі прыцягваюць неабходнасць пераўтварэнняў у вобласці арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Паколькі мы хочам выхаваць высокадухоўную асобу, сапраўднага прафесіянала, неабходна памятаць аб тым, што такое магчыма толькі пры ўмове, калі вучэбныя ўстановы будуць даваць сваім студэнтам якасныя

агульнаадукацыйныя і прафесійныя веды. І, галоўнае, вучыць моладзь самастойна мэтанакіравана і сістэматычна авалодваць ведамі не толькі ў час вучобы, але і ў час далейшай працы, гэта значыць бесперапынна. Такім чынам, неабходнасць самастойнай работы студэнтаў дыктуецца сучаснымі абставінамі, пры якіх хуткімі тэмпамі адбываецца павелічэнне аб'ему навуковай інфармацыі.

Важным аспектам дзейнасці выкладчыка з'яўляецца падрыхтоўка студэнта да самаадукацыі: выпрацоўка мэтанакіраванасці, стараннасці, дапытлівасці; фарміраванне і развіцце зацікаўленасці да засваення ведаў.

Практыка паказвае, што фарміраванне уменняў і навыкаў самастойнай работы магчыма на занятках любых прадметаў. Аднак нам хацелася б спыніцца непасрэдна на занятках па беларускай літаратуры. Менавіта тут можна выкарыстоўваць наступныя віды самастойнай работы:

-работа з першакрыніцамі (мастацкім тэкстам) і спецыяльнай літаратурай (літаратуразнаўчай);
- работа з падручнікам і вучэбнай літаратурай;
- падрыхтоўка і выкарыстанне наглядных дапаможнікаў;
- індывідуальныя практычныя заняткі ( пазааўдыторныя гадзіны);
- выкананне курсавых і дыпломных работ і інш.

Задача выкладчыка-славесніка ў тым, каб пры арганізацыі прапанаваных відаў самастойнай работы прымяняць разнастайныя найбольш эфектыўныя прыёмы.

Асаблівай увагі заслугоўвае работа з галоўнай крыніцай ведаў – кнігай: мастацкай, навуковай, вучэбнай і даведачнай літаратурай. Самастойна працуючы з кнігай студэнты вучацца арыентавацца ў плыні інфармацыі, вучацца выдзяляць сутнасць праблемы, галоўнае, весці запісы. Вядома, што такая праца праводзіцца пад кіраўніцтвам выкладчыка і вынікі яе кантраліруюцца. У залежнасці ад зместу заняткаў, мэтавай устаноўкі, узроўня падрыхтаванасці студэнтаў магчыма выкананне такіх відаў запісаў, як выбар цытат (напрыклад, пры складанні цытатнага плана характарыстыкі таго ці іншага літаратурнага героя); складанне плана адказа ці паведамлення; запіс асноўных палажэнняў тэкста – тэзісаў; канспектаванне, напісанне рэфератаў і дакладаў.

Пры планаванні індывідуальных заняткаў са студэнтамі неабходна звярнуць увагу на тое, каб заданні былі дастаткова высокага ўзроўня складанасці і, ў той жа час, зразумелымі і пасільнымі для выканання. Патрэбна адзначыць, што тэрмін выканання індывідуальных заданняў студэнт выбірае сам, зыходзячы з канкрэтных умоў, у залежнасці ад аб'ема абавязковай нагрузкі і сваіх здольнасцей.

Заўважана, што значнаму павышэнню ўзроўня самастойнасці студэнтаў спрыяе прадуманая арганізацыя работы па вырабу і выкарыстанню

эфектыўнага сродка навучання – нагляднасці. Напрыклад, пры вывучэнні манаграфічнай тэмы студэнты рыхтуюць альбом, прысвечаны жыццю і творчасці таго ці іншага пісьменніка, дзе змешчаны важныя звесткі з біяграфіі, урыўкі з мастацкіх твораў, крытычныя артыкулы, фотаздымкі, малюнкі і г.д. Падбор матэрыялу пры падрыхтоўцы і далейшая праца з самаробным дапаможнікам патрабуе ад студэнтаў умення самастойна творча мысліць, вызначаць істотныя факты, параўноўваць, абагульняць свае веды, рабіць вывады.

Важныя навыкі самастойных заняткаў фарміруюцца пры рабоце над курсавымі і дыпломнымі праектамі. Выконваючы гэтую працу, студэнт займаецца самастойнай работай над літаратурным матэрыялам: адбірае неабходную літаратуру, складае бібліяграфію, пры дапамозе спецыяльных метадаў навуковага даследавання паглыблена вывучае абраную літаратурную тэму.

Такім чынам, завяршаючы прыведзеныя разважанні пра віды самастойнай работы студэнтаў і спосабы яе арганізацыі пры вывучэнні беларускай літаратуры, падкрэслім значнасць гэтага напрамку пры падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў. Менавіта арганізацыя самастойнай работы дазваляе павысіць якасць навукова-тэарэтычнай падрыхтоўкі педагагічных кадраў, непасрэдна ўплывае на ўзровень педагагічнага майстэрства будучых настаўнікаў.

## САМОСТОЯТЕЛЬНАЯ КОНТРОЛИРУЕМАЯ РАБОТА - ОСНОВА ПРОЧНЫХ ЗНАНИЙ

***Рябушко А. П.,*** *проф., д. ф-м. н.,*
***Морозова И. М.,*** *доц.,к. ф-м. н.,*
***Жур Т. А.,*** *к. ф-м. н.*
*Белорусский государственный аграрный технический университет*

Многолетний опыт преподавания математики убеждает, что чтение лекций, проведение аудиторных практических и лабораторных занятий не обеспечивают глубокого и прочного знания предмета, даже если был соблюден доступный и в тоже время достаточно высокий научно-методический уровень преподавания. Излагаемый материал не усваивается или недостаточно усваивается студентами без систематической самостоятельной проработки теории и применения ее к решению задач, персонально ему выданных преподавателем. А в условиях сокращения количества аудиторных занятий по дисциплине высшая математика, самостоятельная работа студента - это один из важнейших этапов в учебном процессе, и он требует тщательно продуманной организации контроля.